# ДРУКАВАНАЯ КНІГА ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

***Сапега Таццяна Андрэеўна,*** *загадчык сектара абслугоўвання навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Вызначэнне тэрміна “кніга” – адна з самых складаных навуковых праблем. Тып грамадства, змены ў сферы ягоных каштоўнасных прыярытэтаў уплываюць на спосаб адносінаў і ўспрыняцця грамадствам кнігі [52, с. 10]. На сённяшні дзень не існуе адзінага абагульняючага і агульнапрызнанага вызначэння гэтага паняцця, што абумоўлена перш за ўсё складанасцю кнігі як грамадскай з’явы, разнастайнасцю яе зместу і структуры, а таксама неаднаразовымі змяненнямі яе матэрыяльнай формы. Ахапіць і адлюстраваць усё гэта ў адным лаканічным вызначэнні – задача надзвычай складаная.

Некаторыя спецыялісты ўвогуле выказваюцца пра немагчымасць даць адзінае, вычарпальнае вызначэнне кнігі. Французскі даследчык Р. Эскарпі ў сваёй працы “Рэвалюцыя ў свеце кніг” пісаў пра тое, што кніга не ўкладваецца ў жорсткія рамкі вызначэнняў [59, с. 20]. Расійскі кнігазнаўца А. Барсук адзначаў, што аналіз вызначэнняў кнігі прыводзіць да высновы пра шматаспектнасць, шматфункцыянальнасць і універсальнасць гэтага прадукту духоўнай і матэрыяльнай культуры, а таксама пра немагчымасць усеахопнага вызначэння кнігі [4, с. 11]. Я. Неміроўскі сцвярджаў, што з вялікай колькасці дэфініцый паняцця “кніга” ніводнае ў цяперашні час не можа быць прызнана як агульнапрынятае [46, с. 299]. І. Барэнбаўм канстатаваў, што шматлікія вызначэнні паняцця “кніга” мяняюцца ў залежнасці ад падыходу (фармальнага, сутнаснага, семіятычнага, функцыянальнага, тыпалагічнага, сістэмнага і г.д.) [3].

Я. Неміроўскі вылучае тры аспекты найбольш характэрных вызначэнняў кнігі: апісальны (кніга разглядаецца як прадмет матэрыяльнай культуры); змястоўны (даецца грамадская, палітычная, навуковая сутнасць кнігі); камбінаваны (калі знешнія прыметы кнігі звязваюць з яе зместам, чытацкім прызначэннем і г.д.) [46, с. 299]. Да апісальных належыць вызначэнне, дадзенае ў адпаведнасці з рэкамендацыямі ЮНЕСКА ў 1964 г. Кніга была вызначана як твор друку ў форме кодэкса аб’ёмам звыш трох друкаваных лістоў, г.зн. не менш 49 старонак, не ўлічваючы вокладку (не менш за 5, але не больш за 48 старонак – брашура; творы друку менш за 5 старонак – лістоўкі) [46, с. 299]. Даследчык Ю. Марэцін адзначае, што такі падыход абапіраецца на фармальны крытэрый і не нясе змястоўнай нагрузкі [35, с. 14]. Я. Неміроўскі вызначае яго як статыстычны, што выкарыстоўваецца для адпаведных падлікаў паліграфічнай прамысловасці [39, с. 299].

Заўважым, што па азначэнні ЮНЕСКА да паняцця “кніга” ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

носяцца толькі "творы друку" (ці друкаваныя кнігі). Украінская даследчыца С. Карпенка таксама вызначае кнігу як выключна друкаванае выданне: "Кніга – гістарычна складзеная форма блок-кодэкса неперыядычнага выдання аб'ёмам больш трох друкаваных аркушаў (ці 105 Кб) для замацавання, захавання і перадачы інфармацыі ў часе і прасторы" [25, с. 62]. У беларускім "Тлумачальным слоўніку бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў" кнігай з'яўляецца толькі "неперыядычнае тэкставае друкаванае выданне…" [36, с. 115]. Дакументазнаўства разглядае кнігу як апублікаваны пісьмовы дакумент (выданне) [24, с. 83–85; 35, с. 161–162, 226–227].

Па вызначэннях некаторых даследчыкаў да кнігі можна аднесці як друкаваную, так і рукапісную кнігу. Даследчык Я. Шамурын вызначае кнігу як "твор друку ці рукапіс..." [56, с. 119]. Кнігазнаўца М. Куфаеў даў наступнае азначэнне кнізе: "Кніга з'яўляецца прадуктам чалавечай творчасці і ўяўляе сабой збор аркушаў з рукапісным і друкаваным тэкстам..." [33].

Кнігазнаўцы І. Барэнбаўм [1, с. 11], С. Бушуеў [11, с. 287–289], Б. Косаў [28; 29], Ю. Марэцін [41], Я. Неміроўскі [46, с. 299], М. Яноўскі [60, с. 158] давалі яшчэ больш шырокае азначэнне кнізе, да якой залічвалі не толькі кнігу ў форме кодэкса, але твор пісьменства ці друку любой формы, зафіксаваны на любым матэрыяле. Тады да кнігі ў роўнай ступені можна аднесці гліняныя клінапісныя таблічкі, скруткі, рукапісы, друкаваныя выданні, дыскеты, кампакт-дыскі і інш. Польскі даследчык К. Мігань адзначаў, што калі кніга разглядаецца ў гістарычным кантэксце, то матэрыял для пісьма не з'яўляецца вырашальным фактарам пры вызначэнні прыналежнасці аб'екта да катэгорыі кнігі [43, с. 30]. С. Бушуеў сцвярджаў, што і клінапісныя таблічкі, і папірус, і скрутак, і кодэкс, і CD-ROM выконваюць функцыі кнігі. Змена носьбіта не знішчае кнігу, а толькі мяняе форму яе існавання. Пры гэтым з'яўляюцца некаторыя істотныя якасці і характарыстыкі, новыя праблемы і цяжкасці, якія патрабуюць асэнсавання і аналізу [11, с. 287–289]. В. Мяжуеў адзначаў, што ў памяці камп'ютэра кніга атрымлівае новую форму існавання. Са стварэннем Інтэрнету ўзнікае магчымасць далучэння праз уласны камп'ютэр не толькі да ўжо рэальнага кніжнага багацця, але і да працэсу яго стварэння – да тэкстаў, якія не прайшлі папярэдні этап паліграфічнага друку. Станоўча адказаць, ці з'яўляюцца гэтыя тэксты кнігай, можна пры ўмове, што прызнаецца якасна новая форма існавання кнігі, якая прынцыпова адрозніваецца ад рукапіснай і друкаванай. Папяровыя старонкі замяняюцца ў ёй экранам, які і ёсць адна вялікая кніга з разнародным зместам [42, с. 95–97]. Але існуе і іншае меркаванне. В. Дабравольскі лічыць неабходным увядзенне новага тэрміна, які б вызначаў з'яву "электронная кніга", не змешваючы яго з кнігай традыцыйнай [22].

Дакументазнаўства прапануе агульны тэрмін "дакумент", пад якім мае на ўвазе матэрыяльныя носьбіты рознай формы: ад папіруснага скрутка, гліняных таблічак і рукапісаў да фотаздымкаў, пашпар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоў, кінафільмаў і г.д. [24, с. 75]. Аднак, побач з шырокай трактоўкай ужываюцца і больш вузкія. Амаль у кожнай галіне ведаў маецца свая версія разумення гэтага паняцця ў адпаведнасці са спецыфікай тых аб'ектаў, якім надаецца статус дакумента [35, с. 19–21]. Так, расійскі тэрміналагічны слоўнік "Бібліятэчная справа" канкрэтызуе, што "у бібліятэчна-бібліяграфічнай навуцы і практыцы пад дакументам разумеюцца галоўным чынам творы друку, а таксама неапублікаваныя, аўдыёвізуальныя і іншыя дакументальныя крыніцы інфармацыі" [7, с. 77]. Такое азначэнне дакумента ліквідуе шырокае разуменне кнігі, але не вырашае праблемы акрэслівання самога паняцця "кніга". Украінская даследчыца Н. Кушнарэнка вызначае кнігу як кніжнае выданне, аднак, разглядаючы гісторыю кнігі, вядзе гаворку пра рукапісную і друкаваную кнігу розных форм і матэрыялаў [35, с. 220–226].

Акрамя кнігазнаўчай і дакументазнаўчай канцэпцый існуе культуралагічная, якая разглядае друкаваную кнігу як аб'ект культуры. Зыходзячы з гэтай канцэпцыі, генезіс інфармацыйнага носьбіта ўяўляе сабой прыклад генезісу культурнай формы і культурагенезу ўвогуле [55, с. 264–265]. Стварэнне новых культурных форм інфармацыйнага носьбіта, яго інтэграцыя ў існуючыя культурныя сістэмы, а таксама стварэнне новых інфармацыйных носьбітаў, адлюстроўваюць сацыяльную і гістарычную дынаміку культуры. Генезіс інфармацыйнага носьбіта адлюстроўвае сутнасць культурагенезу, што заключаецца ў працэсе пастаяннага самаабнаўлення культуры не толькі метадам трансфармацыі ўжо існуючых форм і сістэм, але і шляхам узнікнення новых феноменаў, якіх не існавала ў культуры раней.

Канадскі культуролаг М. Маклюэн даследаваў жыццё чалавека ў інфармацыйным грамадстве, у свеце, створаным новымі сродкамі масавай інфармацыі. Ён сцвярджаў, што вядучую ролю ў культуры адыгрываюць камунікацыйныя тэхналогіі. Панаванне тых ці іншых сродкаў сувязі вызначае рысы культуры [40]. М. Маклюэн вылучаў чатыры эпохі ў гісторыі чалавецтва:

1. Эпоха дапісьмовага варварства.
2. Тысячагоддзе фанетычнага пісьма.
3. "Галактыка Гутэнберга" – пяць стагоддзяў кнігадрукавання.
4. "Галактыка Марконі" – сучасная электронная цывілізацыя [5].

Паміж кожным новым сродкам камунікацыі і старымі сродкамі разгараецца безупынная вайна. Адбываецца камунікацыйны выбух, і ўзнікае новая "галактыка". Гісторыя, па М. Маклюэну, – шэраг "галактык", якія змяняюць адна другую і доўгі час могуць, не разбураючыся, але набываючы іншыя канфігурацыі, праходзіць адна скрозь другую [39]. Калі грунтавацца на такім разуменні гісторыі, то ні клінапісная, ні электронная формы фіксацыі тэксту не адпавядаюць паняццю "кніга": у соцыуме гэта да- і паслякніжная формы існавання і функцыянавання адпаведнага зместу [49, с. 86–87]. Друкаваная кніга разглядаецца як кніга "галактыкі Гутэнберга", якая да замены яе электронным носьбітам інфармацыі вызначала твар еўрапейскай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Друкаваная кніга як артэфакт з’яўляецца інтэрпрэтацыйным узнаўленнем культурнай формы, створанай Гутэнбергам. Закладзеная як узор па задавальненні патрэб чалавецтва, яна была рэалізавана ў мностве артэфактаў. Пасля вынаходніцтва кнігадрукавання друкаваныя кнігі як бы запоўнілі інфармацыйную прастору культуры. Наступае “эра кнігі” (М. Куфаеў), “манаполія кнігі” (Л. Уладзіміраў). Друкаваная кніга кожнага гістарычнага перыяду ніколі не была абсалютна тоесная ўвасобленай культурнай форме, а ўзнаўляла яе варыянтна настолькі, наколькі ўмовы рэалізацыі адрозніваліся ад умоў генезісу гэтай формы. Інтэрпрэтацыйны артэфакт з’яўляецца асноўнай формай існавання культурных феноменаў [55, с. 147–149]. Напрыклад, у якасці культурнага феномена мы разглядаем кнігі беларускага першадрукара Францыска Скарыны. “Скарынаўская кніга” з’яўляецца суб’ектыўна інтэрпрэтацыйнай варыяцыяй “Гутэнбергаўскай кнігі”. Узнікненне і развіццё лакальных традыцый цесна звязана са стварэннем і развіццём адпаведных ім кніжных культур [15, с. 12]. Ф. Скарына паклаў пачатак развіццю беларускай кніжнай культуры. Сацыяльная актуальнасць “Гутэнбергаўскай кнігі” вызначаецца працягласцю яе інтэрпрэтацый ў працэсе ўзнаўлення ў якасці культурных артэфактаў – друкаваных кніг.

Як прадукт паліграфіі кніга яшчэ дамінуе на кніжным рынку. Але ўжо цяпер можна зафіксаваць з’яўленне новага віду кніжнай прадукцыі – так званых электронных кніг, здольных змясціць на сваіх “старонках” значна большы аб’ём інфармацыі – ад збору твораў пэўнага аўтара да цэлай галіны ведаў. У будучым, як прадказваюць даследчыкі, адна такая кніга можа замяніць сабой цэлую бібліятэку. Тут можна прагназіраваць некалькі форм культурнай зменлівасці – якасці ініцыяванага ці спантаннага самаабнаўлення культуры – развіццё і дэградацыю. З аднаго боку, назіраецца страта кнігай свайго першапачатковага сэнсу, змена гэтага сэнсу, інтэрпрэтацыі і ацэнкі кнігі ў грамадскай думцы, што характэрна для дэградацыі аб’екта. З другога боку, кніга, займаючы сваю унікальную нішу ў сістэме традыцыйных духоўных каштоўнасцей, шукае сваё месца і ў электроннай культуры будучыні. Змену культурнай формы кнігі можна назіраць ужо сёння. Беларуская даследчыца Ю. Болатава сцвярджае, што беларуская кніга імкнецца, не страчваючы сваёй унікальнай сацыяльнай і культурнай ролі, адпавядаць сучаснай парадыгме. Так, многія падручнікі выдаюцца з дадаткам аўдыё- і відэаматэрыялаў. Назіраецца выбух выяўленчасці ў кнігавыданні. Кніга ў каляровай вокладцы, з ілюстрацыямі стала больш заўважальнай. З’яўляюцца кнігі нетрадыцыйнай формы [8, с. 25–29].

Даследчыкі неадназначна інтэрпрэтуюць праблему кніжнай культуры і цывілізацыі. З аднаго боку, яны пацвярджаюць фарміраванне адзінай сусветнай супольнасці з неабмежаванымі магчымасцямі камунікацыі, з другога боку, занепакоены магчымасцю страты культуры. У першым выпадку кніга разглядаецца як з’ява гістарычная, што саступае месца новым носьбітам інфармацыі. А. Пяцігорскі сцвяр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

джае, што з друкаванай кнігай адбудзецца тое, што калісьці адбылося з рукапіснай [48, с. 94]. У. Эка параўноўвае манітор з універсальнай кнігай, дзе свет прадстаўлены ў словах і падзелены на старонкі [58]. Р. Эскарпі падкрэсліваў, што кніга з'яўляецца вынікам тэхнічных працэсаў і падпарадкавана ім. Тэхніка змяняе саму кнігу, а таксама яе месца і ролю ў жыцці чалавецтва [59, с. 20]. Адначасова даследчыкі занепакоены віртуальнасцю сацыяльнай рэальнасці і рэзка супрацьпастаўляюць "кніжную культуру" і "электронную цывілізацыю" (ці "беспапяровае грамадства", "інфармацыйнае грамадства"). У якасці сінонімаў супрацьлегласцям "кніга і інфармацыя" выказваецца класічнае супрацьпастаўленне "культура і цывілізацыя". Кніга, як культура ў тэорыі нямецкага культуролага О. Шпенглера, выкладзенай ім у працы "Закат Еўропы" [57], уяўляе з сябе жывы арганізм, дае прастору для развіцця літаратуры і мастацтва, для творчага росквіту асобы і індывідуальнасці. У "інфармацыйнай цывілізацыі" няма месца для творчасці, у ёй пануе тэхніка і бяздушны інтэлект, яна ператварае людзей у істоты. Па меркаванні М. Бярдзяева, у культуры акцэнтуецца духоўны, індывідуальны, якасны, эстэтычны, стабільны, часам кансерватыўны пачатак, а ў цывілізацыі – матэрыяльны, колькасны, тыражаваны, агульнадаступны, дэмакратычны, прагрэсіўны [6]. Менавіта такія ўласцівасці прыпісваюць адпаведна "кніжнай культуры" і "электроннай цывілізацыі".

Такім чынам, прыхільнікі "тэхнізацыі культуры" разглядаюць друкаваную кнігу пераважна як спосаб фіксацыі сэнсавай інфармацыі з мэтай яе перадачы ў часе і прасторы і маюць рацыю ў тым, што "манаполія кнігі", безумоўна, скончылася. Аднак традыцыйная кніга, на нашу думку, нягледзячы на развіццё эфектыўных сродкаў інтэлектуальнай камунікацыі, не толькі выжывае і не страчвае сваёй функцыі як аднаго са сродкаў чалавечага прагрэсу, але і далей развіваецца. Ніводны з новых тэхнічных сродкаў камунікацыі не можа цалкам замяніць кнігу. Але прыхільнікі друкаванай кнігі часта, абараняючы традыцыйныя каштоўнасці, не хочуць заўважаць перавагі новых тэхнічных сродкаў. На наш погляд, кніга з'яўляецца адначасова дасягненнем і культуры, і цывілізацыі, якія непадзельныя і не могуць існаваць адна без другой. Па меркаванні большасці даследчыкаў, друкаваная кніга і электронныя носьбіты інфармацыі будуць суіснаваць. Камп'ютэры, лічыць У. Эка, распаўсюджваюць новую форму адукаванасці, але яны не здатныя задаволіць тыя інтэлектуальныя патрэбы, якія самі і стымулююць. Гіпертэкст зробіць непатрэбнымі "даведачныя кнігі" (слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі), аднак камп'ютэр не заменіць "кнігу для чытання" [58]. Г. Гесэ пісаў, што не трэба баяцца будучага знікнення кнігі, наадварот: чым больш з часам будуць задаволены пэўныя патрэбы мас у забавах і адукацыі з дапамогай іншых вынаходніцтваў, тым больш аўтарытэту верне сабе кніга [19, с. 133].

Метадам параўнання друкаванай кнігі і электронных носьбітаў паспрабуем выявіць адметныя асаблівасці друкаванай кнігі. Такім

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

чынам, вылучаем наступныя ўласцівасці друкаванай кнігі як асаблівага феномена культуры:

1. Унікальнае ўздзеянне на ход культурна-гістарычнага працэсу. Для развіцця культуры ў еўрапейскім маштабе вынаходніцтва Ёгана Гутэнберга з'яўляецца найважнейшым. Яно стварыла тэхнічныя перадумовы інфармацыйнай рэвалюцыі ў Еўропе, адкрыла шляхі для імклівага абмену ідэямі і пашырэння ведаў, стала грунтам небывалага прагрэсу ў галіне адукацыі і асветы [50, с. 18]. Г. Гесэ пісаў, што "друкаваная кніга – адзін з найасаблівейшых і магутных фактараў у культурным жыцці Еўропы" [19, с. 18]. Л. Уладзіміраў адзначаў, што кніга з'яўляецца фундаментам, на якім будуецца культура нацыі [17, с. 15]. Кніжная культура як сістэма характарызуе стан грамадства, яго культуры, духоўнасці, інтэлектуальнага патэнцыялу, сацыяльныя ўмовы і ўзровень тэхналагічнага развіцця [16]. Кніга не толькі фіксуе і распаўсюджвае культурныя дасягненні, але і служыць дзейсным інструментам фарміравання новых культурных каштоўнасцей [22, с. 27–28].

Ролю кнігі ў інтэлектуальным і духоўным прагрэсе грамадства адзначалі шматлікія даследчыкі (І. Барэнбаўм [2], Ю. Болатава [9], А. Грунвальд [21], В. Краўчанка [31] і інш.). А. Гарзон (Калумбія) заўважаў, што Інтэрнет не зможа замяніць кнігу "як інструмент асэнсавання, пасціжэння зместу ці крытычнага аналізу" [18]. Інтэрнет прапанаваў шырокі спектр тэхнічных магчымасцей, якія дапамагаюць змяніць змест і форму паведамлення, аднак пакуль мы не можам казаць пра інтэрнет-культуру, як мы кажам пра кніжную культуру. Адбываецца гэта, на нашу думку, таму, што традыцыйная кніга ўсімі сваімі каранямі была звязана з глыбокімі пластамі культуры, якія складваліся стагоддзямі.

2. Канцэнтрацыя духоўнасці (духоўны патэнцыял друкаванай кнігі). Кніга – не проста форма папяровага прадстаўлення інфармацыі, гэта культурны набытак чалавецтва, звязаны не толькі з матэрыяльным увасабленнем сацыяльнай памяці шматлікіх пакаленняў, але таксама з задавальненнем разнастайных духоўных запытаў чалавека – пазнавальных, камунікацыйных, эстэтычных, этычных і г. д. Кніга звязана з фармаваннем духоўнага свету чалавека, з задавальненнем патрэбаў чалавека ў самавыяўленні і творчасці [51, с. 77]. Інфармацыйныя тэхналогіі патрабуюць, у асноўным, толькі напружання розуму. З кнігай чытач заўсёды вядзе дыялог. Дыялог "чалавек – камп'ютар" мае іншую прыроду. Усе звенні адказаў і пытанняў праграмы загадзя прадуманы і пралічаны [26].

У слоўніках па культуралогіі адзначаецца, што кніга "адлюстроўвае меру духоўнага развіцця чалавека і выступае сімвалам адукаванасці" [30, с. 240; 32, с. 422]. Расійскі філосаф В. Мяжуеў пісаў, што культурны ўзровень чалавека вымяраецца звычайна колькасцю прачытаных кніг, падкрэсліваючы пры гэтым, што гэта не адзіны крытэрый, бо важна і тое, што чытае чалавек і як ён засвойвае прачытанае, але гэты крытэрый – зыходны [42, с. 95]. Індыйскі даследчык Н. Уша-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кумары сцвярджае, што ў іншых СМІ рэдка можна сустрэць такую высокую канцэнтрацыю думкі, як у кнігах [53, с. 20].

3. Дваістасць кнігі як духоўнай і матэрыяльнай з'явы (наяўнасць зместу і матэрыяльнай формы). Кніга разглядаецца як своеасаблівы сінтэзіруючы кампанент культуры – прадукт і духоўнай, і адначасова матэрыяльнай вытворчасці, узятых у адзінстве. Кніжная культура уяўляе з сябе комплексную сістэму, на якую ўплываюць культурны патэнцыял грамадства, цывілізацыя як сукупнасць матэрыяльных і духоўных дасягненняў грамадства [16, с. 86–92].

Некаторыя даследчыкі ставілі ў кнізе на першае месца яе духоўную частку, а матэрыяльную разглядалі як другасную. А. Лавягін лічыў кнігу "адлюстраваннем чалавечых думак" [37, с. 3]. М. Куфаеў называў кнігу "пакункам думкі" [33]. Іншыя лічылі, што кніга атрымала прымяненне, якое выводзіла яе за межы "твора для перадачы і захавання інфармацыі". Яна разглядалася не толькі як духоўная, але і ў значнай ступені як матэрыяльная каштоўнасць. Некаторыя якасці кнігі, што належаць хутчэй да перыферыі яе першапачатковай сутнасці, набывалі незалежнасць і ўспрымаліся як самастойныя каштоўнасці.

Р. Эскарпі заўважае, што на працягу свайго гістарычнага развіцця кніга з'яўлялася не толькі "інструментам для чытання", але мела таксама наступныя формы выкарыстання:

– кніга-прадмет, у які ўкладаюцца грошы;

– прадмет упрыгожвання;

– прымета прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы ці status symbol [59, с. 33].

Беларускі даследчык, бібліяфіл У. Макараў адзначаў, што акрамя інфармацыйнага прызначэння кніга магла служыць эстэтычнай, дыдактычнай, забаўляльнай і іншым мэтам. Для бібліяфілаў яе каштоўнасць павінна была адпавядаць патрабаванням прыгажосці, знаходзілася ў залежнасці ад суадносінаў тэксту і ілюстрацый, ад характару шрыфтоў і якасці паперы. Даследчык вызначае ў якасці асноўных прынцыпаў бібліяфільскай дзейнасці прынцып эстэтызацыі і прынцып індывідуалізацыі кнігі. У бібліяфільскай дзейнасціназіраецца асаблівасць, якая супярэчыць інфармацыйнаму прызначэнню кнігі, – тэндэнцыя да вылучэння асобнага экзэмпляра кнігі адносна агульнага тыражу. У імкненні да абмежавання накладу да мінімальных памераў зліваюцца, з аднаго боку, бібліяфільскі крытэрый рэдкасці для кнігі і, з другога, крытэрый адзінкавасці для твора мастацтва [38].

Графік, жывапісец і мастак кнігі У. Фаворскі пісаў, што "кніга – гэта, з аднаго боку, тэхнічнае прыстасаванне для чытання літаратурнага твора; з іншага боку, – прасторавае выяўленне літаратурнага твора" [54, с. 96]. Ён параўноўваў кнігу з архітэктурай, дзе будынак мае практычнае выкарыстанне і тым не менш становіцца мастацтвам. У. Фаворскі галоўным лічыў стварэнне кнігі, у якой усе элементы знаходзяцца ў складаным адзінстве, дэталі падпарадкоўваюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэламу, а рытм усіх ілюстрацый і ўпрыгожванняў арганізуе логіку чытання. Мастак успрымаў завершаную ілюстраваную кнігу як арганізм з жывым супадпарадкаваннем усіх частак. У У. Фаворскага ўсе структурныя элементы кнігі – глыбока змястоўныя, кожная з іх мае свае ўласцівасці і магчымасці.

Такім чынам, змест кнігі не абмяжоўваецца зместам тэксту. Кніга ўзнікла і рэалізуецца як складаны феномен, які ўяўляе з сябе адзінства вербальнага тэксту, формы і выяўленчага тэксту. Усе элементы кнігі непарыўна звязаны паміж сабой. Звяртаючы на гэта ўвагу, можна сцвярджаць, што сучасная “электронная кніга” кнігай не з’яўляецца, бо ў ёй адсутнічае адзінства духоўнага і матэрыяльнага, што характэрна для кнігі традыцыйнай. У электронным аблічччы кніга перастае існаваць як матэрыяльны аб’ект, з якім непасрэдна ўзаемадзейнічае чалавек [22].

4. Індывідуальнасць. Друкаваная кніга – сродак масавай камунікацыі, таму што яна выдаецца вялікімі тыражамі і становіцца даступнай масавай аўдыторыі. Але ў той самы час яна з’яўляецца сродкам індывідуальнага карыстання. Л. Уладзіміраў пісаў, што кніга ў адрозненне ад іншых сродкаў перадачы інфармацыі прыносіць эстэтычнае задавальненне [17, с. 33]. М. Печанко адзначаў, што чытанне кнігі – дзейнасць больш за ўсё аўтаномная і індывідуалізаваная, за якой заўсёды стаіць індывідуальны густ, а значыць, свабода асобы [47, с. 14–15]. Пра індывідуальнасць як пра асноўную якасць кнігі пісаў М. Куфаеў: “кніга – прадукт індывідуальны і сама па сабе індывідуальнасць” [34, с. 66]. Даследчык М. Ельнікаў адзначаў, што глыбокая адрознасць у прыродзе, сутнасці, прынцыпах, характары функцыянавання, спецыфіка ўспрыняцця і засваення інфармацыі робяць ідэю стварэння “агульнай сістэмы інфармацыйнага патока” пакуль неажыццяўляльнай. Кніга па шматлікіх сваіх сутнасных параметрах ніколі не можа быць у “патоку”, бо яна індывідуальная як у адносінах да радыё, тэлебачання, камп’ютэрных камунікацый, газет, так і ў адносінах да ўсіх іншых кніг [23, с. 20–21].

5. Пастаянства зместу і формы. Радыё і тэлебачанне можна назваць сродкамі “момантавай” ці “экспрэс-” інфармацыі. Іх дзеянне прыпыняецца адначасова з заканчэннем радыё- ці тэлеперадачы. Кніга – сродак пастаяннай інфармацыі, “гэта велізарны рэзервуар, з якога можна чэрпаць інфармацыю ў любы момант і ў любой колькасці ў залежнасці ад патрэбы” [17, с. 15]. Вядома, аўтары могуць мяняць змест кнігі, але, змененая, яна з’яўляеца ўжо новым варыянтам. Стабільнасць жа электронных дакументаў адносная, ім уласціва рухомасць і актуальнасць зместу. Электронныя дакументы атрымліваюць агульнае прызнанне ў якасці кнігі пры ўмове нязменнага захавання іх у электронных і традыцыйных бібліятэках [20]. Апошнія набываюць, такім чынам, функцыю адказнасці за стабільнасць зместу электроннай кнігі. Аднак калі для традыцыйнай кнігі характэрна пастаянства зместу і формы, то для электроннай кнігі матэрыяльная форма не з’яўляецца індывідуальнай [45, с. 25–27]. Кніга як прадукт,

створаны ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, мае рэчавую форму, якая адрозніваецца своеасаблівасцю і індывідуальнасцю элементаў.

6. Падкантрольнасць рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці. Шматлікія даследчыкі праблемы "кніга і культура" адзначалі, што кнігадрукаванне стала рэвалюцыйным крокам наперад у адносінах да глабалізацыі культурных традыцый і рухам да "універсальнай культуры". Аднак пераход да кнігадрукавання, што пашырыў аб'ём і змест інфармацыі, выклікаў адначасова і зніжэнне прэстыжу друкаванага слова. Калі рукапісная кніга ў сілу сваёй працаёмкасці і дарагавізны захоўвала ў пісьмовай культуры найбольш каштоўнае, то друкарскі станок адкрыў шлях, побач з сапраўднымі каштоўнасцямі, для выданняў невысокай якасці. Кніжны рынак, разлічаны на масавы попыт, паглыбіў гэту тэндэнцыю. Кніга паступова страчвала арэол сваёй прыналежнасці да высокай культуры, рабілася прадметам паўсядзённага ўжывання, падобнага да ўсіх іншых звыклых і даступных элементаў побыту. В. Мяжуеў адзначаў, што пераход да кнігадрукавання садзейнічаў і "маральнаму патанненню" кнігі [42, с. 95–97]. Г. Гесэ пісаў пра тое, што даступнасць кнігі кожнаму, з аднаго боку, – прагрэс, але з другога – абясцэньванне і вульгарызацыя духоўнасці [19, с. 133].

Але калі паток друкаваных кніг яшчэ неяк арганізуецца, рэгулюецца і кантралюецца рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасцю, то камп'ютэр здымае і гэтую "перашкоду". Кніга ў электроннай форме аб'ядноўвае ў адной асобе чытача, пісьменніка і выдаўца без пасрэднікаў. Камп'ютэр ліквідуе розніцу паміж прафесіяналам і дылетантам. Як адзначаў В. Мяжуеў, станоўчым у такім сумяшчэнні з'яўляецца шырокае прыцягненне людзей у працэс узаемных слоўных кантактаў, дыялагізацыя слоўнай прасторы ў адрозненне ад былой маналагічнасці друкаванага слова, а адмоўным бокам – засмечванне гэтай прасторы тэкстамі з нулявым узроўнем інфармацыі, што ў канчатковым выніку вядзе да абясцэньвання слова, да зніжэння яго культурнага статуса. Тэхнічны прагрэс у дадзеным выпадку – гэта не толькі крок наперад у сферы культуры, але і крыніца новых пагроз чалавецтву [42, с. 95–97; 48, с. 92–94]. Сёння адбываецца дэідэалагізацыя культуры, адыход ад замкнёнасці, ізаляванасці культуры, у тым ліку кніжнай. Выдаюцца кнігі, што транслююць усе тыпы светапоглядаў. З аднаго боку, атрымліваецца, што менавіта інфарматызацыя грамадства з'яўляецца асновай дэмакратызацыі сучаснай культуры [9, с. 23–24]. З другога, як лічыць беларускі філосаф М. Печанко, кангламерат каштоўнасцяў у выглядзе свабоды тэкстаў, адсутнасць іх іерархіі прыводзяць да дысгармоніі быцця [47, с. 14–15]. Дэмакратызацыя працэсу кнігавыдання як вынік гуманізацыі і гуманітарызацыі палітыкі вызваляе грамадства ад ідэалагічнага падыходу і цэнзурнага вета, але адначасова ўносіць хаос, дэзарганізуе традыцыйна арыентаваную кніжную культуру.

7. Тэкставасць. В. Мяжуеў адзначае, што само па сабе чытанне з экрана істотна не мяняе прыроду зносін чалавека з кнігай. Больш



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сур'ёзную пагрозу кнізе ўяўляе замена слова – пісьмовага, друкаванага, экраннага – малюнкам, ілюстрацыяй, відэарадам, што сталі масавымі сродкамі камунікацыі ў эпоху кіно, тэлебачання і камп'ютараў. Сэнс слова адкрыты толькі розуму. Грэчаскі "логас" азначаў адначасова "слова" і "розум". Чалавек не проста складвае літары ў словы, а словы ў сказы, але і ў думках бачыць прачытанае. Слова як бы заключае ў сабе ўяўна зрокавы свет. Чалавек, свядомасць якога сфармавана не столькі ўдумлівым чытаннем тэксту, колькі бяздумным успрыняццем выключна зрокавай інфармацыі, губляе здольнасць бачыць розумам, мысліць. Зрокам ён замяняе ўяўленне, якое з'яўляецца галоўнай здольнасцю мыслення [42, с. 97]. Італьянскі пісьменнік А. Маравіа таксама выказваў думку, што карэннага адрознення паміж вобразам "кніжным" і "экранным" не існуе. Разыходжанне паміж імі толькі адно, аднак вельмі істотнае: "экранны" вобраз адназначны, ён не дазваляе разыграцца ўяўленню. Глядач успрымае "малюнак" пасіўна, не спрабуе яго інтэрпрэтаваць. Такое ўспрыманне ёсць толькі ўмоўным рэфлексам, што пазбаўлены духоўнага пачатку [44, с. 23]. Х.Л. Борхес пісаў, што калі "мікраскоп і тэлескоп працягваюць вока, тэлефон – голас, плуг і шпага – рукі, то кніга – працяг памяці і ўяўлення" [10]. Расійскі філосаф У. Катасанаў канстатуе: для сучаснай камп'ютэрнай тэхнікі, для алгарытмаў, што выкарыстоўваюцца ў ёй, чалавек уяўляе сабой перашкоду. Сама па сабе тэхніка працуе значна хутчэй, чым здольны рабіць гэта чалавек. Таму для апрацоўкі інфармацыі звяно "чалавек – машына" заўсёды стварае пэўную праблему. Тут неабходна мяняць мову для прадстаўлення інфармацыі, замяняючы мову машыны (нулі і адзінкі) чалавечай мовай слоў. Але фактычна ўсе гэтыя словы чужародныя самой сутнасці інфармацыйнай тэхналогіі і ўяўляюць сабой нейкі "перажытак" менавіта кніжнай культуры. Кніга, наадварот, у вышэйшай ступені суразмерна чалавеку. Алфавітнае пісьмо (у супрацьпастаўленне, з аднаго боку, ідэаграфічнаму, а з другога – машыннай мове з нулёў і адзінак) вельмі блізкае да чалавечай мовы, да жывога чалавечага слова [27, с. 9].

Такім чынам, друкаваная кніга з'яўляецца асаблівым гісторыка-культурным феноменам і выступае як артэфакт культуры, што валодае комплексам адметных прымет, не ўласцівых для іншых носьбітаў інфармацыі. Друкаваная кніга разглядаецца як кніга "галактыкі Гутэнберга", што вызначала твар еўрапейскай культуры да замены яе электроннымі носьбітамі інфармацыі. Нягледзячы на разбурэнне "манаполіі кнігі", друкаваная кніга шукае сваё месца ў электроннай культуры будучыні. Кніга трактуецца як культурны набытак чалавецтва, звязаны не толькі з матэрыяльным узнаўленнем сацыяльнай памяці шматлікіх пакаленняў, але таксама з задавальненнем разнастайных духоўных патрэбаў чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Баренбаум И. Е. К вопросу об универсальности понятия “книга” / И. Е. Баренбаум // Книга. Исследования и материалы. – М., 1977. – Сб. 34. – С. 5–13.

2. Баренбаум И. Е. Книга и история / И. Е. Баренбаум // Книга и культура : Шестая Всесоюз. науч. конф. по проблемам книговедения : Секция общих проблем книговедения : тез. докл. (18–20 апр. 1988 г.). – М., 1988. – С. 2–4.

3. Баренбаум И. Е. Функциональный подход и его применение в книговедении / И. Е. Баренбаум // Книга и социальный прогресс. – М., 1986. – С. 122–131.

4. Барсук А. И. К определению понятия “книга” / А. И. Барсук // Издательское дело. Книговедение. – 1970. – № 6. – С. 3–6.

5. Беляков А. В. Маклюэн (McLuhan) Маршал / А. В. Беляков // Культурология, XX век : энцикл. – СПб., 1998. – Т. 2 . – С. 5–7.

6. Бердяев Н. А. О культуре / Н. А. Бердяев // Антология культурологической мысли. – М., 1996. – С. 195–198.

7. Библиотечное дело : терминол. сл. / сост.: И. М. Суслова, Л. Н. Уланова. – 2-е перераб. и значит. доп. изд. – М., 1986. – 224 с.

8. Болатава Ю. Г. Кніга ў постпісьмовай культуры / Ю. Г. Болатава // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў : матэрыялы навук. канф. (22–23 крас. 1998 г.) / Бел ун-т культуры. – Мн., 2000. – С. 23–29.

9. Болотова Ю. Г. Книга как социокультурный феномен в контексте современной белорусской культуры : дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / Ю. Г. Болатава ; Бел. ун-т культуры. – Мн., 1999. – 154 с.

10. Борхес Х. Л. Книга / Х. Л. Борхес // Борхес Х. Л. Сочинения : пер. с исп. : в 3 т. / Х. Л. Борхес. – Рига, 1994. – Т. 3. – С. 263–270.

11. Бушуев С. В. Электронная и традиционная книга в информационном обществе / С. В. Бушуев // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения “Книга и книжное дело на рубеже тысячелетий” : тез. докл. – М., 2000. – С. 287 – 289.

12. Быченков В. М. Анонимность, безличность, виртуальность / В. М. Быченков // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 65–75.

13. Бярозкіна Н. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX стст.) : вучэб. дапам. для студэнтаў гіст. і бібл. спецыяльнасцей ВНУ / Н. Ю. Бярозкіна. – 2-е выд. – Мн., 2000. – 199 с.

14. Ваднёва Н. Информатизация культурных ресурсов (музеи, библиотеки, архивы) – пути развития / Н. Ваднёва // Музеі і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы : матэрыялы міжнар. канф., Мінск – Полацк, 8–11 крас. 2002. – Б.м., 2002. – С. 68–77.

15. Вальдман И. А. Книга и традиция / И. А. Вальдман // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения “Книга и книжное дело на рубеже тысячелетий” : тез. докл. – М., 2000. – С. 12–13.

16. Васильев В. И. История книжной культуры: Теорет.-методол. аспекты / В. И. Васильев. – М., 2004. – 111 с.

17. Владимиров Л. Книга в век электроники и телевидения / Л. Владимиров // Курьер ЮНЕСКО. – 1972. – № 1. – С. 13–15, 33–34.

18. Гарзон А. Интернет – не лебединая песня книги / А. Гарзон // Всемирный доклад по культуре 2000+: Культурное многообразие: конфликт и плюрализм / предисл.: Китиро Мацуура. – Париж ; М., 2000. – С. 204.

19. Гессе Г. Обращение с книгами. О чтении / Г. Гессе // Гессе Г. Магия книги : сб. эссе, очерков, фельетонов, рассказов и писем о книгах, чтении, писат. труде, библиофильстве, книгоиздании и книготорговле / Г. Гессе. – М.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1990. – С. 18–26.
20. Гиляревский Р. С. Электронная книга: современное состояние и перспективы развития / Р. С. Гиляревский // Книга. Исследования и материалы. – М., 1997. Сб. 74. – С. 51–60.
21. Грунвальд А. От книги к компьютеру: эволюция или революция? / А. Грунвальд // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 54–64.
22. Добровольский В. В. Книга как универсум культуры (к постановке проблемы) / В. В. Добровольский // Библиотека в эпоху перемен: философско-культурологические и информационные аспекты : дайджест / Рос. гос. б-ка. Информкультура. – М., 2003. – Вып. 4 (16). – С. 50–51.
23. Ельников М. П. Книговедение, книга и средства массовой коммуникации (проблема соотношения) / М. П. Ельников // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения "Книга и книжное дело на рубеже тысячелетий" : тез. докл. – М., 2000. – С. 19–21.
24. Зиновьева Н. Б. Документоведение : учеб.-метод. пособие / Н. Б. Зиновьева. – М., 2001. – 207 с.
25. Карпенко С. В. К определению понятия "книга" / С. В. Карпенко // Книга и мировая цивилизация : материалы одиннадцатой Междунар. науч. конф. по проблемам книговедения, Москва, 20–21 апр. 2004 г. : в 4 т. – М., 2004. – Т. 1. – С. 60–62.
26. Катасанов В. Н. Технологии информационной цивилизации и мудрость книжной культуры / В. Н. Катасанов // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 76–81.
27. Кодак Н. Ф. Бытие книги: Заметки о прошлом и настоящем книжного дела / Н. Ф. Кодак, Ю. В. Сиволоб, А. С. Чачко. – Киев, 1991. – 174 с.
28. Коссов Б. И. Ещё раз об определении понятия "книга" / Б. И. Коссов // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения "Книга и книжное дело на рубеже тысячелетий" : тез. докл. – М., 2000. – С. 21–22.
29. Коссов Б. И. Новое в определении понятия "книга" / Б. И. Коссов // Книга и культура : Шестая Всесоюз. науч. конф. по проблемам книговедения : Секция общих проблем книговедения : тез. докл. (Москва, 18–20 апр. 1988 г.). – М., 1988. – С. 47–49.
30. Кравченко А. И. Культурология : словарь / А. И. Кравченко. – М., 2000. – 671 с.
31. Кравченко В. Ф. Культура современной книги (К постановке вопроса) / В. Ф. Кравченко // Книга. Исследования и материалы. – М., 1986. – Сб. 62. – С. 74–90.
32. Культура и культурология : словарь / ред.-сост. А. И. Кравченко. – М. ; Екатеринбург, 2003. – 926 с.
33. Куфаев М. Н. Избранное : труды по книговедению и библиографоведению / М. Н. Куфаев. – М., 1981. – 224 с.
34. Куфаев М. Н. Проблемы философии книги. Книга в процессе общения / М. Н. Куфаев. – М., 2004. – 188 с. : ил.
35. Кушнаренко Н. Н. Документоведение : учебник для вузов культуры / Н. Н. Кушнаренко. – 4-е изд., испр. – Киев, 2003. – 459 с.
36. Леончыкаў В. Е. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных тэрмінаў / В. Е. Леончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя. – Мн., 2003. – 224 с.
37. Ловягин А. М. Основы книговедения : популяр. очерк / А. М. Ловягин. – Л., б.г. – 166 с.
38. Макаров В. В. Книга как предмет культуры и социальной игры во Франции (20–30-е гг. XX в.) / В. В. Макаров // Матэрыялы Першых Кнігазнаўчых чытанняў (Мінск, 15 верас. 1998 г. ) / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– С. 10–23.

39. Маклюэн М. Прошлое и будущее книги / Маклюэн М. // Курьер ЮНЕСКО. – 1972. – № 1. – С. 16–18.

40. Маклюэн М. Вайна і мір у сусветнай вёсцы (урыўкі з кнігі) / М. Маклюэн, К. Фіорэ // Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры. – 1997. – № 1–2. – С. 240–255.

41. Маретин Ю. В. Прошлое и будущее книги: Исторические вехи развития книги / Ю. В. Маретин // Книга и время : сб. ст. – М., 1980. – С. 11–39.

42. Межуев В. Феномен книги и национальное в культуре / В. Межуев // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 95–110.

43. Мигонь К. Наука о книге : очерк проблематики / К. Мигонь. – М., 1991. – 198 с.

44. Моравиа А. Зримый образ и печатное слово / А. Моравиа // Курьер ЮНЕСКО. – 1972. – № 1. – С. 23, 34.

45. Моргенштерн И. Г. Стабильность содержания – атрибут книги / И. Г. Моргенштерн // Девятая международная научная конференция по проблемам книговедения “Книга и книжное дело на рубеже тысячелетий” : тез. докл. – М., 2000. – С. 25–27.

46. Немировский Е. Л. Книга / Е. Л. Немировский // Книга : энциклопедия. – М., 1999. – С. 299.

47. Печенко М. Ф. Книжная культура и духовность / М. Ф. Печенко // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы міжнар. навук. канф. (24–25 лют. 2000 г.) / Бел. ун-т культуры. – Мн., 2000. – С. 11–19.

48. Пятигорский А. Изменение роли книги в обществе / А. Пятигорский // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 92–94.

49. Рац М. В. Книга в “информационном обществе”: о чем речь? Взгляд методолога / М. В. Рац // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 82–91.

50. Саверчанка І. В. Aurea mediocritas: Кн.-пісьм. культура Беларусі: Адраджэнне і ран. барока / І. В. Саверчанка. – Мн., 1998. – 317 с.

51. Семенюк Э. П. Идеи безбумажной информатики и будущее книги / Э. П. Семенюк // Книга и социальный прогресс : Пятая Всесоюз. науч. конф. по проблемам книговедения : Секция общих проблем книговедения : тез. докл. (Москва, 10–12 апр. 1984 г.). – М., 1984. – С. 76–78.

52. Солонин Ю. Н. Книга как нравственная ценность / Ю. Н. Солонин // Книга и культура : Шестая Всесоюз. науч. конф. по проблемам книговедения : Секция общих проблем книговедения : тез. докл. (Москва, 18–20 апр. 1988 г.). – М., 1988. – С. 9–11.

53. Ушакумари Н. Изменение формы. Формирование изменений. Печатная (бумажная) книга vs электронной / Н. Ушакумари // Библиотека в эпоху перемен: философско-культурологические и информационные аспекты. – 2004. – Вып. 2 (22). – С. 20–27.

54. Фаворский В. А. Об искусстве, о книге, о гравюре / В. А. Фаворский. – М., 1986. – 240 с.

55. Флиер А. Я. Культурология для культурологов : учеб. пособие для высш. шк. / А. Я. Флиер. – М. ; Екатеринбург, 2002. – 458 с.

56. Шамурин Е. И. Словарь книговедческих терминов / Е. И. Шамурин. – М., 1958. – 340 с.

57. Шпенглер О. Закат Европы / О. Шпенглер. – М., 1993. – 303 с.

58. Эко У. От Интернета к Гутенбергу / У. Эко // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 275–279.

59. Эскарпи Р. Революция в мире книг / Р. Эскарпи. – М., 1972. – 127 с.

60. Яновский М. Ф. О книге: Опыт анализа понятия “Книга” / М. Ф. Яновский. – Киев, 1929. – 186 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ